# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 16 верасня 1999 года, чацвер, № 13 (1805)


# ВІВАТ, СТУДЭНТ! ВІВАТ, БДУ!




— Быць вартым грамадзянінам Рэспублікі Беларусь — клянёмся!

— Клянёмся! Клянёмся! Клянёмся!

Так услед за рэктарам А.У. Казуліным 1 верасня вымаўлялі словы клятвы ўчарашнія абітурыенты, а сёння — паўнапраўныя студэнты Белдзяржуніверсітэта. Студэнт БДУ — гэта гучыць горда!

Сапраўдным падарункам для першакурснікаў стала свята "Віват, студэнт!", якое адбылося 1 верасня ў Палацы спорту. Яркае сузор'е ззяла на гэтым свяце, сузор'е як беларускіх, так і рускіх майстроў эстрады. Варта згадаць хаця б некаторых з іх.

КВЗ — як заўжды, іскрысты гумар:

— Тэлефануе мне мая дзяўчына і паведамляе: "Я цяжарная".

— А ты ёй што?

— А я сказаў: "Віншую і шчасця табе жадаю. Хай не са мной, дык з іншым".



"Неруш" — вельмі запамінальны выступ. Драматычны "Жорсткі раманс" амаль давёў публіку да слёз. Але другая песня "Ці ж я не хазяйка, ці ж не гаспадыня" настолькі ажывіла народ, асабліва тых, каму давялося патанчыць з артыстамі, што гэтага нават прадбачыць ніхто не мог.

Выхаванец "Зорнай ростані" Валерый Дзядзюля — вельмі таленавіты малады чалавек. Калі па праўдзе, я даўно не чула такой віртуознай ігры, такога апантанага выканання.

Дзмітрый Малікаў... Гэта не апіска. Сапраўды, расійская поп-тусоўка была прадстаўлена адной з самых яркіх і самых інтэлігентных зорак.

Што думае студэнцтва пра гэтую ўрачыстасць? Аляксандр Жукаў, студэнт юрфака БДУ:

— Больш за ўсё мяне здзівіў размах, з якім ладзілася гэтае мерапрыемства. Я думаю, што гэтае грандыёзнае свята выклікала ў першакурснікаў сапраўдны гонар за цяпер ужо свой універсітэт.

*Кацярына САЛАДУХА*
*Фотаздымкі У.М. ЛАДУЦЬКІ*

**ВІНШУЕМ!**

## СТЫПЕНДЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА БАНКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

На сённяшні дзень студэнты вышэйшых навучальных устаноў, якія вылучаюцца выдатнай паспяховасцю і ўменнем праявіць сябе ў грамадскім жыцці ВНУ, маюць магчымасць акрамя асноўнай атрымліваць розныя заахвочвальныя стыпендыі: прэзідэнцкую, памер якой складае 6 мінімальных заробкаў, стыпендыю імя М. Танка (4,5 мінімальных заробкаў), імя А.С. Пушкіна (3,9 мінімальных заробкаў), Ф. Скарыны, М. Багдановіча, П. Броўкі, Я. Карскага, К. Крапівы, Я. Коласа, Я. Купалы.

Прыемным сюрпрызам стала для студэнтаў стыпендыя Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, якая была ўведзена пастановай савета дырэктараў НБРБ № 11.3 ад 22 красавіка бягучага года з мэтай папаўнення банкаўскай сістэмы рэспублікі маладымі спецыялістамі, аказання ім дапамогі і падтрымкі падчас навучання ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах краіны.

Стыпендыя прызначаецца студэнтам дзённай формы навучання, якія навучаюцца банкаўскім спецыяльнасцям, маюць толькі выдатныя адзнакі на працягу двух семестраў і праявілі сябе ў навукова-даследчай рабоце, алімпіядах, конкурсах і грамадскім жыцці навучальнай установы.

Даецца стыпендыя ў дадатак да ўстаноўленай студэнту (навучэнцу) асноўнай стыпендыі, і яе памер складае 4 мінімальныя заробкі студэнтам ВНУ і 3 — навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Кандыдатуры на прызначэнне стыпендый вызначаюцца саветам навучальных устаноў і вылучаюцца з ліку студэнтаў 3-5 курсаў.

У гэтым навучальным годзе такімі шчаслівчыкамі ў БДУ сталі студэнты 5-га курса эканамічнага факультэта Аляксей Чубрык і Юлія Быцкевіч і студэнт 5-га курса факультэта міжнародных адносін Уладзімір Кудравец.

Трэба адзначыць, што студэнтам-стыпендыятам даецца першачарговае права выбару месца праходжання практыкі і працаўладкавання ў сістэме Нацыянальнага банка пасля заканчэння навучальнай установы на пасадах, якія адпавядаюць іх кваліфікацыі.

Так што, ёсць да чаго імкнуцца!

*Валерыя ЛУЦКОВА,*
*студэнтка факультэта журналістыкі БДУ*

**ВЫСТАВЫ**

## СВЕТ ТВОРЧАСЦІ, СВЕТ ЗАХАПЛЕННЯЎ

15 кастрычніка гэтага года Савет жанчын Белдзяржуніверсітэта праводзіць святочны вечар, прысвечаны Дню маці. У рамках свята будзе наладжана выстава, прымеркаваная да гэтай даты.

Дэвіз выставы — свет-творчасці, свет захапленняў. На ёй можна будзе пабачыць малюнкі і вырабы, зробленыя рукамі дзяцей, а таксама пазнаёміцца з творчасцю іх бацькоў — цікавымі калекцыямі, кулінарнымі вырабамі, дарункамі садоў і гародаў, арыгінальнымі рэчамі. Пераможцы своеасаблівай выставы-конкурсу атрымаюць прызы.

Заяўкі на ўдзел у выставе прымаюцца да 1 кастрычніка 1999 года па адрасе: праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, галоўны корпус, пакой № 109. У заяўцы неабходна ўказаць назву экспаната, яго памеры і вагу, прозвішча, імя, імя па бацьку, падраздзяленне БДУ і тэлефон.

*Па больш падрабязную інфармацыю можна звяртацца па тэлефонах: 226-59-50, 268-70-81.*

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

# АМАЛЬ КОЖНЫ ДРУГІ АБІТУРЫЕНТ БДУ БЫЎ МЕДАЛІСТАМ

Сёлета ўступная кампанія ў Белдзяржуніверсітэце пачалася, як і год таму, на дзесяць дзён раней, чым у іншых ВНУ краіны. Гэта дало магчымасць большай колькасці юнакоў і дзяўчат паспрабаваць свае сілы і пазмагацца за права называцца студэнтамі БДУ. А такіх жадаючых было 5471 чалавек. З іх амаль палова медалістаў, каля тысячы — выпускнікі ліцэяў і гімназій. Як бачым, у прыёмнай камісіі была магчымасць (і адначасова складаная задача) выбраць лепшых з лепшых. Такімі шчаслíўчыкамі сталі 1808 чалавек — яны былі залічаныя на першы курс дзённай формы навучання па 40 спецыяльнасцях на 15 факультэтаў. Астатнія ж мелі магчымасць стаць студэнтамі-платнікамі альбо паказаць свае здольнасці ў іншых навучальных установах.

Самымі папулярнымі спецыяльнасцямі ў гэтым годзе былі інфармацыя і камунікацыя, міжнароднае права, сучасная англійская мова і літаратура. Найменшы конкурс быў на спецыяльнасці сучасная французская мова і літаратура, класічныя мовы і антычная літаратура, фізіка.

Калі ж прааналізаваць вынікі ўступных экзаменаў, то варта адзначыць, што ўсяго было атрымана 1377 двоек. Самым складаным для абітурыентаў аказаўся экзамен па матэматыцы (пісьмова) — амаль кожны трэці, хто яго здаваў, атрымаў адзнаку "2". Нялёгкім быў і экзамен па хіміі — кожны пяты атрымаў нездавальняючую адзнаку. Што да выдатных адзнак, то іх усяго было 1852. Найбольш на экзамене па беларускай мове і літаратуры (вусна) — 35 працэнтаў з тых, хто яго здаваў, атрымалі "5". Каля 30 працэнтаў такіх выдатнікаў было на экзамене па замежнай мове (вусна, аўдзіраванне), каля 26 — па геаграфіі.

Зразумела ж, былі абітурыенты, якія не згаджаліся з ацэнкай сваіх ведаў. Тады яны звярталіся ў апеляцыйную камісію. Некаторыя зрабілі гэта нездарма — у 11 выпадках з 40 адзнака была павышана.

Калі паглядзець па рэгіёнах, то можна звярнуць увагу на тое, што на дзённую і завочную форму навучання ў БДУ найбольш залічана студэнтаў, натуральна, з Мінска — каля 55 працэнтаў ад агульнай колькасці. Амаль 16 — з Мінскай вобласці, далей ідуць Гродзенская, Брэсцкая, Гомельская, Магілёўская і Віцебская вобласці. Прыемна адзначыць, што папулярнасць нашага універсітэта расце і па-за межамі краіны. Так, сёлета 98 чалавек з Расіі пажадалі навучацца ў БДУ, 22 з іх пашчасціла.

*Таццяна КУХАРЧУК*

ЯК ЖЫВЕШ, ІНТЭРНАТ?

# ПРЫТУЛАК — КОЖНАМУ СТУДЭНТУ

Канец жніўня — самая спякотная пара для ўсіх, хто хоць нейкім чынам звязаны з засяленнем студэнтаў у інтэрнаты. Студэнтаў шмат, і кожнаму трэба даць прытулак. Таму і працаваць у такія дні даводзіцца аж да васьмі, а то і дзесяці гадзін вечара. "Але ўлічваюцца ўсе пажаданні студэнтаў і пакрыўджаных няма", — запэўнілі карэспандэнта "Беларускага універсітэта" старэйшыя інспектары па засяленні Алена Мікалаеўна Васільева і Алена Уладзіміраўна Канчэўская, а таксама намеснік дырэктара студгарадка па сацыяльных пытаннях Ала Уладзіміраўна Мелех. Пасля жанчыны пераглянуліся, дадалі "пакуль няма" і тройчы пастукалі па дрэве.

Каму "пашчасціла" пры засяленні, дык гэта злосным парушальнікам дысцыпліны — іх проста не засялілі ў інтэрнат. А перад тымі студэнтамі, хто меў запазычанасці па аплаце і пагасіў яе перад засяленнем, інтэрнат гасцінна расчыніў дзверы.

Не было ніякіх праблем і ў хла[illegible] і дзяўчат, якія навучаюцца на платнай а[illegible]ве. Іх засялялі разам са студэнтамі-бюджэтнікамі, а не пасля іх. І яны карыстаюцца тымі ж правамі, хіба што аплата за пражыванне ў іх прыкладна ў два разы вышэйшая.

Нягледзячы на тое, што яшчэ рамантуюцца і шосты, і першы інтэрнат, месца хапіла ўсім. Нават студэнтам-платнікам першага курса.

# НАВАСЕЛЛЕ АДКЛАДВАЕЦЦА

Ужо ў верасні гэтага года павінен быў адчыніць дзверы перад студэнтамі інтэрнат № 6. Але... Самы рэальны тэрмін — Новы год. Праблема — цокальны паверх, дзе знаходзяцца душавыя, якія неабходна абліцаваць пліткай. Плошчу ў 1500 кв. м дзесяць майстроў абліцуюць не раней чым за тры месяцы. Ёсць пэўныя недапрацоўкі і на паверхах.

Больш складаная сітуацыя з інтэрнатам № 1, наваселле ў якім таксама адкладзена на больш далёкі тэрмін. Пасля падпісання праекта змяніліся супрацьпажарныя нормы, і перакрыцце верхняга паверху давядзецца перарабляць.

А тым часам ужо іншыя інтэрнаты [illegible] раіліся ў чаргу на капітальны рамонт.

*Вольга КУЛІКОВА*

ВЕСТКІ З ЛІЦЭЯ

# ВЫПУСК-99

"Не лічы кветачкі ўвесну, а палічы ягадкі ўвосень", — гаворыць народная мудрасць. Па восені, пасля ўступных іспытаў, палічылі сваіх ягадак-выпускнікоў у ліцэі пры БДУ. У гэтым годзе са сценаў ліцэя выйшла 229 чалавек. З іх паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы 222 ліцэісты (97%). І толькі сямёра (3%) пакуль засталіся за бортам вышэйшай адукацыі.

Большасць ліцэістаў пры паступленні аддалі перавагу роднаму універсітэту. Студэнтамі БДУ сталі 187 хлопцаў і дзяўчат (82%). Па факультэтах гэта выглядае так:

механіка-матэматычны — 9 чалавек;
факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — 47;
радыёфізікі і электронікі — 18;
фізічны факультэт — 16;
філалагічны — 26;
хімічны — 19;
журналістыкі — 3;
гістарычны — 14;
біялагічны — 14;
міжнародных адносін — 8 чалавек;
эканамічны — 1;
факультэт філасофіі і сацыяльных навук — 5;
юрыдычны — 7.

Не абмінулі выпускнікі ліцэя і іншыя інстытуты і універсітэты нашай сталіцы. Пяцёра пажадалі вывучыцца на дактароў, чацвёра сталі студэнтамі Лінгвістычнага універсітэта, па адным абралі БДТУ, БДПА, ЕГУ, двое звязалі свой лёс з БДЭУ, а сямёра даверылі сваё навучанне БДУІРу.

Прыемна адзначыць, што веды нашых ліцэістаў далі ім магчымасць навучацца ў ВНУ як бліжэйшага, так і далёкага замежжа. Ёсць нашы выпускнікі ў маскоўскіх ІКСІ (2 чалавекі) і МФТІ (8 чалавек), у будапешцкай Міжнароднай школе бізнесу (1 чалавек), у Амерыканскім універсітэце, што знаходзіцца ў Сафіі (1 чалавек).

*Вольга КУЛІКОВА*

КАНФЕРЭНЦЫІ

# РЭФОРМА ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

У чацвёрты раз Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ прымаў у сваіх сценах навукоўцаў і педагогаў ВНУ з усяго свету. Традыцыйна пераважная большасць удзельнікаў канферэнцыі — прадстаўнікі Беларусі. Аднак на гэты раз нас парадавалі сваёй прысутнасцю такія госці, як прэзідэнт Канфедэрацыі асацыяцый рэктараў Еўрапейскага Саюза, прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі Ірландыі і Галандыі, якія прысутнічалі як эксперты на абмеркаванні законаў вышэйшай адукацыі, а таксама прафесары з Расіі, Украіны і Літвы.

Несумненна, толькі сціплыя фінансавыя магчымасці абмяжоўвалі колькасць прадстаўнікоў СНД і Цэнтральнай Еўропы, хаця на гэты раз міністэрствам адукацыі было вылучана 200 млн рублёў на правядзенне канферэнцыі.

Як паведаміў прарэктар па вучэбна-метадычнай працы РІВШ БДУ С.С. Вятохін, навуковыя распрацоўкі па стварэнні перспектыўнага праекта закона, які рэгуляваў бы дзейнасць вышэйшай школы Беларусі, ужо знайшлі падтрымку ў еўрапейскіх экспертаў. Пэўна, ні адна краіна СНД не зможа пахваліцца такой вялізнай праграмай рэфармавання вышэйшай школы. Менавіта Беларусь першай у СНД пачала пераход да 12-гадовай сярэдняй адукацыі, што патрабуе ад ВНУ новых падыходаў да набору абітурыентаў, прафарыентацыі і перагляду зместу вышэйшай адукацыі. Ужо сёння распрацоўваецца новы класіфікатар спецыяльнасцей, якія патрабуюць вышэйшай адукацыі, плануецца спрасціць сістэму надання кваліфікацый, укараняецца сістэма цэнтралізаванага тэсціравання на ўступных экзаменах, што павысіць аб'ектыўнасць адбору для навучання лепшых абітурыентаў. Гэтыя і іншыя праблемы разглядаліся ў выступах удзельнікаў канферэнцыі.

На канферэнцыі таксама было пастаўлена пытанне аб стварэнні Інфармацыйнага цэнтра, які мусіць служыць экспертнай арганізацыяй па ўсіх праблемах вышэйшай школы. З яго стварэннем краіна зробіць яшчэ адзін крок на шляху далучэння да Лісабонскай канвенцыі аб прызнанні кваліфікацый, якія адносяцца да вышэйшай адукацыі ў еўрапейскім рэгіёне.

Правядзенне такіх канферэнцый дае не толькі магчымасць удзельнікам заявіць пра сябе, але і спрыяе вырашэнню многіх пытанняў адукацыі.

*Валерыя ЛУЦКОВА,*
*Ксенія МАСАЛЁВА,*
*студэнткі факультэта журналістыкі*

# ЭЛІТНЫ ФАКУЛЬТЭТ ДЛЯ ЭЛІТНАЙ МОЛАДЗІ

*Нагадаем нашым чытачам, што прыкладна паўгода таму "Беларускі універсітэт" распавядаў пра планы па стварэнні эканамічнага факультэта ў БДУ. Такі факультэт быў створаны. А гэтым летам прайшоў першы набор студэнтаў. Пра тое, што ўдалося здзейсніць з задуманага, пра задачы і планы новага факультэта мы папрасілі расказаць дэкана эканамічнага факультэта БДУ прафесара Міхаіла Міхайлавіча Кавалёва.*



Дэкан эканамічнага факультэта – прафесар Міхаіл Міхайлавіч КАВАЛЁЎ

**— Міхаіл Міхайлавіч, раскажыце, калі ласка, як прайшла прыёмная кампанія?**

— З 1 верасня на эканамічным факультэце БДУ да заняткаў прыступілі каля 650 студэнтаў. Яны навучаюцца па трох спецыяльнасцях: эканоміка, эканамічная тэорыя, менеджмент. На першы курс ва ўмовах жорсткага конкурсу каля пяці чалавек на месца (у нас усе абітурыенты здавалі чатыры экзамены без традыцыйных ільготаў і прывілеяў медалістам, пераможцам алімпіяд) прынята 82 чалавекі на бюджэтную форму навучання і каля 40 — на платную. Асабліва вялікі конкурс быў на новую спецыяльнасць эканоміка — на 20 месцаў прэтэндавалі толькі адных медалістаў 58. Гэта не дзіўна — упершыню ў рэспубліцы мы будзем рыхтаваць эканамістаў-аналітыкаў, якія спалучалі б глыбокія тэарэтычныя веды сучасных эканамічных тэорый і вопыт выкарыстання найноўшых інструментаў практычнай эканамічнай работы: эканамічныя мадэлі, камп'ютэрныя тэхналогіі электроннага гандлю і віртуальнага маркетынгу ў Інтэрнэт, нацыянальная сістэма рахункаў і бухгалтарскага ўліку і г.д. Нагогул, варта адзначыць, што на мяжы стагоддзяў эканоміка карэнным чынам мяняецца і як навука — пад уплывам эканамічных мадэляў і баз статыстычных дадзеных яе законы становяцца больш падобнымі да законаў фізікі, — і як бізнес — камунікацыйныя магчымасці Інтэрнэт карэнным чынам мяняюць умовы канкурэнцыі, тэхналогіі гандлю, маркетынгу і кааперацыйнай вытворчасці. Асаблівасць новага факультэта — спалучэнне навучання з практычнымі даследаваннямі ў сучасных галінах эканомікі і бізнесу.

**— І якім чынам гэта будзе ажыццяўляцца?**

— Усе без выключэння студэнты з першага па пяты курс будуць удзельнічаць у канкрэтных праектах, якія выконваюць выкладчыкі, аспіранты, магістранты па заданні прадпрыемстваў, фірмаў, фондаў. Характар працы студэнтаў будзе шчыльна звязаны з фундаментальнымі курсамі, якія яны вывучаюць. Прывяду прыклады канкрэтных прац, якія выконваліся гэтым летам студэнтамі ў межах пілотнага праекта стварэння пры БДУ міждзяржаўнага цэнтра электроннага гандлю. Студэнты, якія праслухалі курс "Маркетынг", падрыхтавалі разгорнуты даклад "Маркетынг у Інтэрнэт", у якім прааналізавалі магчымасці сусветных сетак падтрымкі гандлю тыпу сеткі "Trade point" ЮНКТАД — ВТО, Асацыяцыі сусветных гандлёвых цэнтраў (WTCA). Пасля курсу "Грошы, банкі, крэдыт" студэнтамі падрыхтаваны агляд "Электронныя грошы і іх уплыў на манетарныя паказчыкі". Нават курс замежнай мовы, а на нашым факультэце гэта 8 гадзін на тыдзень на працягу трох гадоў з трыма экзаменамі, суправаджаўся працай па заказах. Напрыклад, студэнты-другакурснікі ў межах ужо згаданага праекта правялі і пракаменціравалі мадэльныя законы ЮНСІТРАЛ па электронным гандлі і электронных гандлёвых дакументах, нацыянальныя законы (ЗША, Аўстраліі і г.д.) па падаткаабкладанні і бяспецы электроннага бізнесу. Старэйшыя ж студэнты гэтым летам стварылі электронныя магазіны, даследавалі кан'юнктуру беларускага рынку інфармацыйных паслуг, сістэматызавалі сусветныя рэсурсы ў галіне эканомікі, бізнесу, гандлі і стварылі пошукавы сайт — партал, гэта своеасаблівая Yellow page у Інтэрнэт. За кожным студэнтам, які прайшоў такога кшталту сучасную эканамічную падрыхтоўку, ганяюцца беларускія прадстаўнікі замежных фірмаў, сучасных прадпрыемстваў. Адным словам, мы імкнемся адпавядаць лозунгу эканамічнага факультэта "Элітны факультэт для элітнай моладзі".

**— Згадзіцеся, што словазлучэнне "элітная моладзь" у нас доўгі час мела крыху негатыўнае адценне...**

— Думаю, што прыйшоў час ад гэтага адмаўляцца. Поспеху дабіваецца толькі тое грамадства, якое не выроўнівае ўсіх, а дае магчымасць эліце рэалізаваць сябе. І калі раней у нас элітныя школьнікі ішлі ў фізікі і лірыкі, і мы мелі "впереди планеты всей" атамныя бомбы і балет, то сёння трэба, каб інтэлектуальная эліта пайшла ў эканоміку і бізнес. Калі самыя таленавітыя будуць праектаваць тканіну, абсталяванне для макаронных фабрык, гадзіннікі, трактары і складаць планы іх прасоўвання на сусветныя рынкі, то ў гэтым выпадку ўсяму беларускаму народу будзе забяспечана годнае жыццё. Я ўвогуле лічу, што многія нашы сённяшнія беды ад вострага недахопу адукаваных эканамістаў. У недапушчальных макраэканамічных памылках многіх дзяржаўных рашэнняў павінны не столькі палітыкі, колькі іх эканамічныя дарадцы. Палітыкі не абавязаны разбірацца ў тонкасцях эканомікі, яны абавязаны толькі выбіраць сабе прафесійных саветнікаў, што ў беларускіх умовах не проста. Таму адна з мэтаў факультэта — рыхтаваць прафесійных саветнікаў, экспертаў па эканоміцы.

**— Вы ставіце свайму факультэту звышзадачу. А хто будзе рыхтаваць такіх спецыялістаў? Дзе вы возьмеце кадры?**

— Яны ўжо сёння на факультэце ёсць. Гэта больш за 50 выкладчыкаў, з іх больш за 30 прафесараў і дацэнтаў, арганізавана 5 кафедраў: эканамічных навук (макраэканомікі і эканамічнай палітыкі), эканамічнай тэорыі, менеджменту, банкаўскай і фінансавай эканомікі. Акрамя таго, пры факультэце функцыянуе Цэнтр маркетынгавых даследаванняў, у якім выкладчыкі і студэнты выконваюць заказныя працы. У бліжэйшых планах — стварэнне сумеснай лабараторыі з банкамі, якая аб'ядвае шматлікія праекты, якія выконваюцца сёння ў інтарэсах банкаўскай сістэмы. Гэта і працы па небанкаўскіх плацяжах і электронных грошах, па даследаванні фактараў, якія найбольш востра ўплываюць на экспартны патэнцыял Беларусі, па тэхналогіях плацежнай сістэмы, па выданні навукова-практычнага часопіса "Фінансавы аналіз". Дарэчы, у банкаўскім сектары рэспублікі працуе шмат прафесійных эканамістаў-аналітыкаў. Разам з імі з 1 верасня мы ажыццяўляем яшчэ адзін праект — падрыхтоўку банкаўскіх аналітыкаў. На працягу года (пры завочным навучанні), здаўшы экзамен па аналітычных метадах макраэканомікі, банкаўскай справе, статыстыцы, фінансавым менеджменце і падрыхтаваўшы магістэрскую дысертацыю па практычных, актуальных для беларускага банкаўскага сектара праблемах, можна атрымаць дзяржаўны дыплом магістра эканамічных навук.

**— Сапраўды, такая прапанова, відаць, зацікавіць многіх, асабліва тых, хто не мае базавай эканамічнай адукацыі альбо атрымаў яе па спрошчанай праграме камерцыйнай ВНУ. І колькі будзе каштаваць магістэрская адукацыя?**

— Каля 1000 долараў ЗША. Для якаснай адукацыі гэта не шмат. Для параўнання, у Фінансавай акадэміі г. Масквы, праграмы якой мы ўлічваем у нашым праекце, год навучання абыходзіцца каля 5 тысяч долараў, а аналагічная адукацыя за мяжой каштуе 20-30 тысяч долараў.

**— Але ж за мяжой іншы ўзровень жыцця...**

— Згодзен. Таму і сумы ў нас значна ніжэйшыя пры такім жа альбо нават вышэйшым узроўні адукацыі. Да таго ж, галоўны прынцып на факультэце — выдатнікі павінны вучыцца бясплатна. Тыя ж, у каго няма такіх здольнасцей, могуць і заплаціць, у тым ліку і за тое, што вучацца на такім факультэце. Пры працаўладкаванні ў нас, як і за мяжой, вельмі цэніцца тое, які універсітэт ты скончыў, з кім на курсе ты разам вучыўся. Карпаратыўнасці, уменню ісці разам усім курсам па жыцці мы надаем не меншае значэнне, чым ведам.

*Таццяна КАЗАК*

# Дыяменты зямлі беларускай

## (паўночны маршрут)

Сёлета, упершыню пасля доўгага перапынку, студэнты другога курса геафака праходзілі комплексную міжрэгіянальную практыку. Для яе былі падрыхтаваны тры цудоўныя маршруты: Палескі, Прыдняпроўскі і Паазерскі. Кожны з іх заслугоўвае падрабязнага разгляду, але спынімся на самым паўночным з іх — на Паазерскім, па якім вандравалі эколагі і турысты.



Від на возера Стустра і Снуды з гары Маяк

Наша зямля змяшчае шмат скарбаў. І адзін з найвыдатнейшых — тэрыторыі, якія амаль не закранула антрапагеннае ўздзеянне. На шляху паўночнага маршруту гэта былі Бярэзінскі біясферны запаведнік і Нацыянальны парк "Браслаўскія азёры".

Бярэзінскі біясферны запаведнік знаходзіцца ўсяго ў сотні кіламетраў ад Мінска. Ён, дзякуючы шырокаму колу навуковых назіранняў (так, метэастанцыя запаведніка працуе па шэрагу міжнародных праграм, адна з якіх — ICP WATHER — праводзіць пашыраны спектр звычайных назіранняў), а ў большай ступені дзеля першазданнай прыроды зоны змяшаных лясоў, мае сусветную вядомасць. Сапраўды, на амаль 1500 гектарах запаведніка можна сустрэць усе магчымыя віды балот, падзівіцца на непаўторнае чаргаванне ўзвышшаў і лагчын, зазірнуць ў шматлікія люстэркі вадаёмаў, параўнаць звычайныя бярозы з рэліктавымі карэльскімі, убачыць занесеныя ў Чырвоную кнігу расліны. Захаваліся ў запаведніку і такія рэдкія ў іншых месцах жывёлы, як рысь, буры мядзведзь, шырока распаўсюджаны бабёр, для аховы якога і быў арганізаваны па ініцыятыве прафесара А.Ул. Фядзюшына ў 1923 г. запаведнік. Сёння для аматараў прыроды тут створаны даволі прывабныя ўмовы: працуе Музей прыроды, пракладзена экалагічная сцяжына, наведвальнікі маюць магчымасць размясціцца ці ў сучасных нумарах гасцінічнага комплекса, ці бліжэй да прыроды — у драўляных дамках на ўскраіне лесу.

Нацыянальны парк "Браслаўскія азёры" знаходзіцца на поўначы Беларусі. Ён значна маладзейшы за Бярэзінскі біясферны запаведнік (быў утвораны ў жніўні 1995 года на базе ландшафтнага заказніка), але тут таксама ёсць на што падзівіцца. Калі глядзець на азёры Стустра і Снуды з вяршыні гары Маяк, то перад вачыма адкрываецца цудоўная панарама, вытрыманая ў блакітна-зялёных танах. Зяляніна хваёвых лясоў адцяняецца зялянінай астравоў, раскіданых па сінечы азёраў, а чысты блакіт неба робіць халмiста-марэнны краявід выдатнейшым на нашай зямлі. Толькі на возеры Стустра, на востраве Чайчын, можна пабачыць адзінае ў Беларусі астраўное паросла чаротам возера, а ўся акваторыя Снудаў і тэрыторыя яго астравоў уваходзіць у аднайменны арніталагічны заказнік. Тут ахоўваюць чайку срабрыстую, паганак, краншнэпа, кулік-сароку, а таксама іншых вадаплаўных птушак. Цудоўныя ўмовы адпачынку створаны і для турыстаў, якіх прываблівае чыстае паветра, непаўторныя краявіды, выдатная рыбалка, магчымасць наведаць цікавыя музеі.

Недалёка ад Браслаўскіх азёраў размяшчаецца гідралагічны заказнік "Міжазёрны", дзе асноўная ўвага надаецца захаванню экасістэм азёр Паўночны і Паўднёвы Волас. Апошняе з іх вядомае як самае чыстае возера Беларусі — празрыстасць вады дасягае 7 метраў. Акрамя гэтага, тут сустракаюцца ўсе 5 рэліктавых ракападобных ледавіковай эпохі: немезіда, пантапарэя, бакаплаў Паласа, лімнакалянус і шыракапалы рак,— занесеныя ў Чырвоную кнігу.

Давялося пабываць і на многіх іншых цікавых прыродных аб'ектах: на азёрах Навалукомскае, Доўгае (якое, дарэчы, з'яўляецца самым глыбокім у Беларусі — 53,7м), Нарачанскай і Ушацкай групах азёр, Вілейскім вадасховішчы, Слабадской і Свянцянскай градах.

Скарбонкамі культуры нашай зямлі з'яўляюцца музеі. Іх экспазіцыі складаюцца на працягу многіх гадоў, а экспанаты перадаюць каларыт эпохі. І ў кожным з музеяў ёсць нешта такое, што адрознівае яго ад іншых, нешта, чаго больш нідзе не знойдзеш.

Паўночны маршрут пралягаў праз старажытны Полацк. Праграма знаёмства з гэтым горадам была вельмі цікавай і насычанай. У час экскурсіі па горадзе мы сцісла пазнаёміліся з яго славутымі мясцінамі, а потым наведалі найбольш цікавыя з іх. Спачатку мы наведалі дзеючы Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, што быў заснаваны ў 11-м стагоддзі вядомай беларускай асветніцай Еўфрасінняй Полацкай. Потым наш шлях пралёг да Сафійскага сабора, які з'яўляецца помнікам архітэктуры 14-га стагоддзя. За час свайго існавання ён многае пабачыў, выконваў розныя функцыі, але, нягледзячы на ўсё гэта, захаваў сваю непаўторнасць. Сёння сабор выкарыстоўваецца ў якасці культавай пабудовы і як канцэртны зал — кожную нядзелю тут у тры гадзіны апоўдні праходзяць канцэрты арганнай музыкі, праводзяцца таксама і фестывалі. Потым мы пабывалі ў музеі кнігадрукавання і музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага, дзе пабачылі ўвесь доўгі шлях да сучаснай кнігі.

Вельмі доўга можна расказваць і пра Браслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей, сапраўдным скарбам якога з'яўляецца музей рамёстваў. Тут можна не толькі ўбачыць і набыць вырабы народных майстроў Браслаўшчыны, але і на свае вочы пабачыць, як з простых лазовых пруткоў ці саломкі ствараюцца сапраўдныя мастацкія цуды, якія на гады захоўваюць цяпло рук свайго стваральніка.

Экспазіцыя Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея таксама дапаўняецца экспазіцыяй мясцовага дома рамёстваў. І калі Браслаўшчына вядомая ў большай ступені пляценнем з саломкі, пісанкамі, разьбой па др[illegible] то візітная картка Глыбокага – [illegible] кавальскія вырабы. Гледзячы на іх, цяжка падумаць, што звычайнае жалеза можа прымаць такія фантастычна лёгкія формы. Пабачыць жа ўсю гэтую прыгажосць можна не толькі ў музеі і доме рамёстваў, але і непасрэдна на вуліцах горада. І што прыемна — браслаўскія, і глыбоцкія майстры перадаюць свае тэхнікі дзецям — сваім пераемнікам, што дазваляе не страціць важны культурны пласт жыцця народа. На Глыбоччыне наведалі мы і Мосарскі касцёл — выдатны архітэктурны помнік класіцызму 18-га стагоддзя, парк якога разбіты згодна з лепшымі еўрапейскімі традыцыямі.



Мосарскі касцёл

А ў вёсцы Валынцы Верхнядзвінскага раёна, на радзіме вядомага географа І.Дз. Чэрскага, у звычайнай сельскай школе створаны найвыдатнейшы па сваёй экспазіцыі і падборы матэрыялу краязнаўчы музей, якому могуць пазайздросціць многія гарадскія музеі. Тут прадстаўлены дакладны макет касцёла, які быў створаны тым жа майстрам, што будаваў полацкую Сафію і ў якім калісьці хрысцілі славутага земляка. На жаль, сёння касцёла не пабачыш — ён быў знішчаны ў

30-я гады. Акрамя гэтага, у музеі створаны вельмі багатая па інфармацыі біялагічная экспазіцыя, што змяшчае выдатна зробленыя чучалы жывёл і гербарый, які расказвае пра расліны гэтай тэрыторыі. І ўся гэта экспазіцыя прыносіць карысць людзям — тут шырока праводзяцца тэматычныя ўрокі не толькі мясцовай, але і навакольных вясковых школ.

здзівіш. Але, пераступіўшы парог выставы вышываных карцін Алены Перазевай, мы былі да глыбіні душы ўражаны іх мастацкімі якасцямі, дакладнасцю перадачы на карцінах самых дробных дэталяў, ліній і формаў. Было адчуванне, што дакранаешся да сапраўднай казкі. Таму пагледзіце навокал — і вы знойдзеце што-небудзь, што пры ўваж-



На месцы стаянкі на гасціннай Глыбоччыне

Давялося нам пабываць і ў Пскоўскай вобласці Расіі, у музеі-запаведніку "Пушкінскія горы". Тут таксама мы пабачылі шмат цікавага, дакрануліся да сусветнай культурнай спадчыны, якая непарыўна звязана з імем вялікага паэта А.С. Пушкіна.

І, канешне, расказ пра скарбы беларускай зямлі будзе не поўны, калі не ўспомніць пра людзей, нашых землякоў, дзякуючы працы якіх і збіраюцца многія скарбы. Прозвішчы ўсіх назваць немагчыма, таму хочацца яшчэ раз падзякаваць усім ім за іх руплівую працу, дзякуючы якой на першы погляд звычайныя рэчы становяцца сапраўднымі каштоўнасцямі, за іх гасціннасць і адкрытасць і пажадаць далейшых поспехаў, якія пойдуць на карысць усім нам.

Беларуская зямля багатая на розныя скарбы. І калі нехта лічыць, што ўсе яны ўжо даўно адкрытыя, то ён памыляецца. Сведчанне — выпадак, які адбыўся з намі ў апошні дзень практыкі. Здавалася, што пасля 11 дзён вандравання, калі давялося праехаць больш за дзве тысячы кіламетраў, пабачыць многа цікавых рэчаў, наведаць такія прадпрыемствы, як Лукомская ДРЭС, ВА "Палімір", Глыбоцкі малочнакансервавы завод, Браслаўскі рыбзавод і шэраг іншых, нас ужо нічым не



Падчас наведвання Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў Полацку

лівым разглядзе зазіхаціць, заззяе новымі, невядомымі раней гранямі. І падарожнічайце па беларускай зямлі — яна змяшчае яшчэ шмат вядомых і невядомых скарбаў, дакрануўшыся да якіх вы атрымаеце сапраўднае задавальненне!

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*інфармацыйны сектар маладзёжных арганізацый геафака*

САКРЭТ ФІРМЫ

# У БДУ будзе новы цэнтр

Завершаны новы этап важнага ўрадавага даручэння па распрацоўцы канцэпцыі Міждзяржаўнага цэнтра электроннага гандлю (МЦЭГ). Падрыхтаваная вучонымі-эканамістамі БДУ справаздача ў пяці кнігах (бізнес-план МЦЭГ, аналіз сусветнага вопыту, камплект прававых дакументаў, плацёжныя сістэмы, класіфікатары тавараў) была прадстаўлена Прэзідэнту Беларусі. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову аб працягу працы над рэалізацыяй праекта на базе БДУ як галаўной арганізацыі і даручыў унесці прапановы аб рэалізацыі праекта за кошт сродкаў бюджэту Саюза Беларусі і Расіі.

*Ул. інф.*

АБ'ЯВЫ

**Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта**

аб'яўляе конкурс

на замяшчэнне пасад:

- малодшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі малекулярнай генетыкі бактэрый;
- навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі матэматычнага мадэліравання ў электроніцы — 2;
- навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі інфармацыйных сістэм — 1;
- старшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі інфармацыйных сістэм — 1;
- старшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі статыстычнага аналізу і мадэліравання — 1.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: *220050, г. Мінск, Белдзяржуніверсітэт, вул. Бабруйская, 9, Навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 406, 407, тэл. 226-47-64.*

**Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем Белдзяржуніверсітэта**

аб'яўляе конкурс

на замяшчэнне вакантных пасад:

- старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі лекавых сродкаў на аснове мадыфікаваных полісахарыдаў;
- старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі структурна-хімічнага мадыфікавання палімераў;
- навуковага супрацоўніка сектара высокатэмпературных рэакцый;
- малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў.

Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы прымаюцца па адрасе: *220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.*

ПРЭС-АПЫТАННЕ

# АДПАЧЫНАК ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

*Кожны студэнт на працягу навучальнага года марыць пра адпачынак, асабліва пра лета, калі за акном грэе сонейка і спяваюць птушкі. Але часам бывае так, што пасля доўгіх і цяжкіх экзаменаў нядчасны студэнт не толькі страчвае сілы і жаданне адпачываць, але не мае галоўнага – магчымасці. Чаму? Каб адказаць на гэтае пытанне, дастаткова прыгадаць велічыню стыпендыі, якая складае ў сярэднім каля 2 мільёнаў, а гэтага ў наш час не хапае нават на білет у адзін бок да бліжэйшага марскога курорта.*

*І вось лета скончылася, пачаліся працоўныя будні. Мы вырашылі пацікавіцца ў саміх студэнтаў, чым яны займаліся падчас летніх канікулаў.*

**Аляксей, студэнт 3-га курса педуніверсітэта:**

— Усё лета праходзіла вельмі марудна: спачатку бясконцыя спробы прайсці тэст у аўташколе, затым дапамагаў бацькам будаваць хату ў Маладзечне. Такім чынам, ніякага адпачынку не атрымалася.

**Максім, студэнт 2-га курса БДУ:**

— Я нічога не рабіў! Адпачываў дзе давядзецца... Часцей — дзе-небудзь за горадам. Карацей, бібікі біў!

**Аксана і Дзяніс, студэнты 3-га курса філфака БДУ:**

— Мы пасвілі кароў у вёсцы, дапамагалі бабулі...

**Алена, студэнтка 3-га курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ:**

— Лета прайшло добра. Я працавала педагогам у дзіцячым аздараўленчым лагеры. Вельмі спадабалася: праца з дзецьмі заўсёды прыемная, асабліва тады, калі за гэта яшчэ і грошы плацяць.

**Раман і Руслан, студэнты 5-га курса фізічнага факультэта БДУ:**

— Нам вельмі падабаецца падарожнічаць, і таму мы робім гэта заўсёды, калі ёсць вольны час. На канікулах мы спачатку зараблялі грошы, а потым адпачывалі ў Севастопалі, Варшаве, Празе і Бургасе. Але больш спадабалася Прага, вельмі цудоўны горад!

**Алег Шлома, студэнт 5-га курса факультэта міжнародных адносін БДУ:**

— Я працаваў старшым важатым у летнім лагеры ў Амерыцы, штат Вірджынія. Як гэта ў мяне атрымалася? Убачыў аб'яву ў Інтэрнэт і вырашыў паспрабаваць сябе. А праз два тыдні атрымаў ліст, дзе былі віншаванні з тым, што я прайшоў па конкурсе. Безумоўна, было вельмі прыемна.

**Дзмітрый, студэнт 5-га курса факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ:**

— У чэрвені я быў на армейскіх зборах у Барысаве, пасля чаго магу запэўніць усіх і ўсё, што "Чырвоная Армія ўсіх мацней!"

**Хайсан, студэнт 5-га курса медыцынскага універсітэта:**

— Вось ужо чацвёртае лета застаюся ў Мінску, сп'янелы ад прыгажосці тутэйшых жанчын, а ўжо ўзімку наведваю бацькоў.

*Валерыя ЛУЦКОВА,*
*студэнтка факультэта журналістыкі БДУ*

БІРЖА ПРАЦЫ

# ЦІ БЫЦЬ БУДАТРАДАМ?

У наш час аднаўляюцца многія традыцыі. У тым ліку — і ў маладзёжным руху. Адна з такіх традыцый — студэнцкія будаўнічыя атрады.



Усё пачыналася ў 50-х. Тады будатрады былі сапраўдным увасабленнем рамантыкі і патрыятызму. Яны былі народжаны жыццёвай неабходнасцю і шчырым жаданнем прыносіць канкрэтную карысць. Першымі ластаўкамі гэтага руху ў Беларусі сталі студэнцкія атрады Белдзяржуніверсітэта і цяперашняй Беларускай політэхнічнай акадэміі:

Пачыналася з уборкі хлеба на цаліне. Потым было будаўніцтва кацельняў, цеплатрас, клінік, былі рамонтныя працы.

Сёння будатрадаўскі рух крыху змяніў сваё аблічча. Няма ніякага прымусу, і студэнты, якія ездзяць у будатрады ў апошнія два гады з часу іх адраджэння, амаль усе засталіся задаволеныя сваім выбарам. Дастаткова зірнуць на іх шчаслівыя твары на фотаздымках.

Найбольш характэрнае меркаванне пра студэнцкія атрады выказаў Валерый Адайнік, студэнт 4-га курса геаграфічнага факультэта БДУ:

*— На маю думку, студэнцкія будаўнічыя атрады — гэта рэальная магчымасць зарабіць грошы падчас летніх канікулаў. Схема працы простая: ёсць жаданне — прыходзіш, працуеш, атрымліваеш грошы. Калі не прыходзіш, калі не працуеш, то і грошай аніякіх быць не можа. Увогуле, я, дый многія хлопцы, думаю, набылі новых сяброў, завязаліся нейкія карысныя кантакты. Мы не адчулі напоўніцу, на жаль, дух адзінства, агульнасці, бо ж толькі працавалі мы разам, а ўвечары — па дамах. Калі б працавалі дзесь па-за межамі Беларусі... Асабіста я задаволены і нават ганаруся сабой, бо, па сутнасці, гэта першыя грошы, заробленыя сваёй працай, сваімі рукамі. Спадзяюся, што наступным летам змагу зноў працаваць у будатрадзе. Добра б — дзе-небудзь на выездзе, хай нават недалёка ад Мінска.*

А дзе ж працавалі сёлета? Студэнты Белдзяржуніверсітэта гэтым летам працавалі на будаўніцтве навучальнага корпуса універсітэта ў вёсцы Шчамысліца, на рэканструкцыі інтэрната Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта, крытага катка ў парку імя М. Горкага.

Фарміраваў атрады камітэт БПСМ БДУ. А дысцыпліну строга падтрымлівалі самі байцы — найменшае правапарушэнне, невыкананне правілаў тэхнікі бяспекі пазбаўляла магчымасці працягваць працаваць у атрадзе. У БДУ такіх парушальнікаў было трое...

Але ж было і дзеля чаго старацца. Напрыклад, заробак за дзень у студэнцкіх будатрадах Белдзяржуніверсітэта складаў ад 1,2 да 1,5 мільёна беларускіх рублёў (залежна ад віду і маштабу зробленай працы).



Дык ці быць надалей будатрадам?

*Кацярына САЛАДУХА*

ЛЕТА-99

# У заробкі – на курорт!

Лета для студэнта — час не толькі адпачынку, але і працы. Ужо некалькі гадоў запар у нашым універсітэце арганізуюцца працоўныя атрады. Сёлета, як і папярэднія гады, студэнты БДУ ездзілі працаваць у Крым. У кожную з трох зменаў ездзілі пяць груп па 25 чалавек. Першая змена збірала персікі, другая — падвязвала вінаград, а трэцяя працавала на яго зборы. Студэнты заплацілі па 9 мільёнаў за дарогу і па 20 мільёнаў за пражыванне. Працаваць было цяжка, але ўсім спадабалася.

Сваімі ўражаннямі падзялілася студэнтка 2-га курса Лінгвістычнага універсітэта Юлія Сазонава, якая працавала на зборы вінаграду:

— Прачыналіся ў шэсць гадзін і працавалі да дванаццаці. Норма была дзесяць вядзёр за дзень. Аднак у першыя дзянькі я збірала па дзевятнаццаць і была першай у групе.

— А што вы рабілі ў вольны час?

— Пасля працы хадзілі на мора, загаралі. Вечарамі гулялі, былі на дыскатэках. Гэта быў мой самы цудоўны адпачынак, які я ніколі не забуду. І збіраюся туды зноў у наступным годзе.

*Ксенія МАСАЛЁВА,*
*студэнтка факультэта журналістыкі БДУ*

ДАІ ПАВЕДАМЛЯЕ

# Дзеці ідуць у школу

З 20 жніўня па 20 верасня праводзіцца аперацыя "Увага! Дзеці ідуць у школу". Галоўная задача — аднавіць у школьнікаў дарожную дысцыпліну пасля летніх канікулаў. Таму не выпадкова транспартныя сродкі рухаюцца з запаленымі фарамі.

Выконваць правілы дарожнага руху вельмі важна. І не толькі ў гэтыя дні. Так, толькі за лета работнікамі ДАІ зарэгістравана больш за 30 парушэнняў правілаў дарожнага руху сярод супрацоўнікаў БДУ. Сярод іх трое затрыманых у п'яным выглядзе за рулём, пяць аштрафаваных за перавышэнне хуткасці, трое — за няправільны пераход вуліцы, трое — за язду без вадзіцельскіх дакументаў.

Паважаныя супрацоўнікі і студэнты БДУ! Віншуем вас з пачаткам новага навучальнага года і яшчэ раз нагадваем, што захоўваць дысцыпліну на дарогах неабходна.

*Мікалай СКІПАР,*
*дзяржаўтаінспектар ДАІ Маскоўскага раёна*

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

# ПРАЗ ПСІХАЛАГІЧНЫ БАР'ЕР

*Ні для каго не сакрэт, што чалавек, пакінуўшы сцены школы, сутыкаецца з шэрагам праблем, своеасаблівым псіхалагічным бар'ерам. Па-першае, гэта адчуванне сябе дарослым і самастойным, якое часам не адпавядае рэчаіснасці, а па-другое, гэта часам доўгае і цяжкое прызвычайванне да новага калектыву.*

*Для таго каб лепей разабраца ў гэтай сітуацыі, мы звярнуліся да загадчыцы лабараторыі клінічнай псіхалогіі БДПА А.М. Калодзіч.*

**— Алена Мікалаеўна, на вашу думку, развітанне са школай — гэта лёгкі працэс ці працэс карэннай ломкі выпускніка?**

— Па-рознаму. У большай ступені гэта залежыць ад настаўніцкага калектыву, задачай якога з'яўляецца паступовая ўнутраная падрыхтоўка дзіцяці да развітання са школай і ўваходу ў новае жыццё. Адаптацыя — гэта працэс пераладжання, бо кожны прыходзіць са сваімі звычкамі і ўстаноўкамі, і цягам такога пераладжання часта ідзе пэўнае прыстасоўванне, што негатыўна ўплывае на працэс адаптацыі.

**— Ці падрыхтаваныя дзеці да навучання ў ВНУ: ці маюць яны дастатковую псіхічную, фізічную і адукацыйную базу?**

— Немагчыма адказаць агульна. На першым курсе студэнты вельмі моцна адрозніваюцца адзін ад аднаго. Некаторыя маюць вельмі добрую школьную базу і могуць прэтэндаваць на месца другакурсніка, іншыя ж — слабенькія і доўгі час не могуць трапіць у каляіну. Большасці студэнтаў не стае самастойнасці ў плане арганізацыі разумовай працы, грамадскай дзейнасці. У сувязі з няпоўнай стыкоўкай патрабаванняў школы і ВНУ ўзнікае жаданне сысці ад усяго гэтага, асабліва падчас першай сесіі, калі ў студэнта пачынаецца трансавы стан. Некаторыя на самой справе не вытрымліваюць нагрузкі, бо многа праблемаў са здароўем і г.д.

**— Па якіх псіхалагічных законах жывуць школа і ВНУ?**

— Вылучыць якія-небудзь канкрэтныя законы вельмі складана. Відавочна толькі адно: у школе адносіны паміж дзецьмі маюць адкрыты, больш эмацыйна насычаны характар. У ВНУ ж усе кантакты індывідуалізаваныя, бо вялікая доля адказнасці кладзецца на кожнага асабіста. Тут ужо кожны сам за сябе.

**— Як вам здаецца, ці трэба займацца планаваннем груп, праводзячы папярэднія тэсціраванні, анкетаванні і г.д., як гэта робіцца на Захадзе?**

— 50 на 50. Ужо на пачатку навучальнага года ў ВНУ праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы (прысвячэнне ў студэнты і г.д.), і гэта збліжае і аб'ядноўвае студэнтаў. Я лічу больш эфектыўным варыянтам правядзенне сацыяльна-псіхалагічнага трэнінгу ў групах. Гэта дазваляе кожнаму развіваць у сабе тыя навыкі, якіх яму не стае.

**— У школе мы часта чуем слова "лідэр". А ці існуе такое паняцце ў ВНУ, і ці заўжды лідэр у школе становіцца лідэрам у ВНУ?**

— Безумоўна, і ў ВНУ ёсць свае лідэры, але крытэрыі адбору маюць істотныя адрозненні. Пераход ад школьнага лідэра да лідэра ВНУ адбываецца далёка не заўжды. Гэта вельмі індывідуальна. Многія са школьных лідэраў захоўваюць свае пазіцыі інтэлектуальных лідэраў, некаторыя ж наадварот становяцца дастаткова пасіўнай часткай групы. Гэта прыклад таго, што з дзіцяці зляпілі лідэра ў школе, а не ён сам сцвердзіўся сярод аднагодкаў.

**— А каму цяжэй адаптавацца — школьнаму лідэру ці таму, хто прызвычаіўся не вылучацца?**

— Гэта залежыць ад таго, наколькі пазіцыя чалавека адпавядае яго ўнутранай сітуацыі. У большай ступені пацерпіць той, хто не змог рэалізаваць сябе ў якасці лідэра ў школе і перанёс гэтую праблему ў ВНУ. У выніку з'яўляюцца дыктатарскія замашкі альбо празмерны страх.

**— А скажыце, калі ласка, хто, паводле статыстыкі, хутчэй адаптуецца — дзяўчаты ці хлопцы, і з чым гэта звязана?**

— На жаль, я не ведаю статыстыкі, але са сваіх асабістых назіранняў магу зрабіць выснову, што дзяўчаты адаптуюцца крыху хутчэй, бо яны ўвогуле больш пластычныя. Але ў хлопцаў працэс адаптацыі адбываецца больш роўна і эфектыўна за кошт выяўленага ў меншай ступені саперніцтва паміж сабой.

**— Адкажыце, калі ласка, на пытанне як выкладчык: ці падрыхтаваныя выпускнікі да выбару прафесіі? Ці многа сярод іх выпадковых студэнтаў і як адбываецца працэс адаптацыі ў іх?**

— На самой справе, шмат. Проста мала хто прызнаецца ў гэтым. Яны ніяк не адаптуюцца, бо працэс навучання іх унутрана не мяняе. Існуюць таксама паўвыпадковыя студэнты, аднак у некаторых з іх усё ж з'яўляецца інтарэс да прафесіі.

**— І ўсё ж, праблема адаптацыі — гэта праблема настаўнікаў, выкладчыкаў, бацькоў ці іх нашчадкаў?**

— Канешне, самі студэнты вырашаюць гэтую праблему. Гэта іх унутраная пазіцыя і актыўнасць, іх падрыхтаванасць да супрацоўніцтва з іншымі людзьмі наогул. З боку выкладчыкаў патрабуецца ўвага да студэнта, а з боку бацькоў — ухвала.

Мы павінны заўжды памятаць, што лягчэй адаптуюцца тыя, хто адкрыты для свету і іншых людзей, хто гатовы чуць, разумець і прымаць іншых людзей. Аднак самае галоўнае — гэта асэнсаванасць выбару і ўменне адказваць за яго.

*Валерыя ЛУЦКОВА, студэнтка журфака*

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ЛЕТНЯЯ ТВОРЧАЯ АКАДЭМІЯ

Закрыццё Летняй творчай акадэміі адбылося 6 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў Мінску. Яна была арганізавана Форумам еўрапейскіх студэнтаў (AEGEE) у супрацоўніцтве з факультэтам мастацтва ЕГУ.

Як сказала дырэктар праекта Летняй творчай акадэміі Кацярына Радзько, галоўнай мэтай было пазнаёміць студэнтаў з беларускай спадчынай, фальклорам і, безумоўна, наладзіць зносіны паміж студэнтамі з розных краін Еўропы.

У Летняй творчай акадэміі прымалі ўдзел студэнты з розных краін свету (Польшча, Германія, Турцыя, Нідэрланды), а таксама з ВНУ Мінска. Адной дружнай сям'ёй яны выбраліся ў незабыўны тур па Беларусі: Нясвіжскі і Мірскі замкі, вячэра ў мужчынскім манастыры ў Жыровічах, мастацкая студыя Рышарда, мультыплікацыйныя стужкі І. Волчака, вандроўкі па гарадах і мястэчках нашай краіны. Свае ўражанні яны адлюстравалі ў карцінах і гліняных фігурках. Хаця многія ўпершыню бралі пэндзаль у рукі (а пагатоў — гліну), атрымалася вельмі прыгожа.

Сярод навучэнцаў было праведзена чатыры конкурсы: экспрэс-маляванне пад кіраўніцтвам Вольгі Івашкевіч, кантактная пластыка над наглядам акцёра тэатра "Вольная сцэна" Міхаіла Кашэльскага, самаробная кераміка пад кіраўніцтвам Ларысы Фінкельштэйн і курс беларускай мовы праз драматургію для замежных студэнтаў.

Сярод усіх твораў гэтай незвычайнай навучальнай установы асаблівa ўражвала сваёй шматколернасцю і авангардызмам калектыўная карціна студэнтаў Летняй творчай акадэміі.

Замежным студэнтам вельмі не хацелася пакідаць Беларусь і новых сяброў. І нашы студэнты таксама наведалі краіны, адкуль прыязджалі да нас замежныя госці.

Дарэчы, у наступным годзе плануецца правядзене яшчэ адной падобнай акцыі. Удзельнічаць могуць усе жадаючыя. А для таго, каб стаць членам Еўрапейскага форуму студэнтаў, патрэбна няшмат: быць студэнтам мінскай ВНУ, заплаціць узнос і ведаць англійскую мову.

*Ксенія МАСАЛЁВА, студэнтка факультэта журналістыкі БДУ*

АНОНС

# НОВЫ ПОЗІРК

У Нацыянальным музеі Беларусі праходзіць фотавыстава "Новы позірк. 1929. Фотаздымкі Ціны Мадоцці". На ёй можна ўбачыць унікальныя фотаздымкі пачатку стагоддзя.

Выстава будзе працаваць да 18 верасня. Так што ў вас яшчэ ёсць час яе наведаць. А больш падрабязна пра саму Ціну Мадоцці і яе творчасць чытайце ў наступным нумары "Беларускага універсітэта".

*Ксенія МАСАЛЁВА*

**ВЕДАЙ НАШЫХ!**

# КВЗ

**Каманда Высокапалётная, Затое Замаладая**

“Мы начынаем КВН...”. Кожны раз, пачуўшы першыя словы вядомай песні, мы на злом галавы ляцім да экрана тэлевізара. Бо КВЗ у нашым разуменні — невычарпальная крыніца гумару, іскрыстага і, як кажуць, злабадзённага (нездарма ж ён называецца Клубам вясёлых і знаходлівых).

Юрмала, цёплае мора (хаця і Балтыйскае), ласкавае сонца, чыстае паветра... “Але прычым тут КВЗ?” — спытаеце вы. Усё элементарна — ужо чацвёрты год тут адбываецца Музычны фестываль камандаў КВЗ “Голосящий Кивин”. Хаця першы фестываль адбыўся ў Маскоўскім Палацы моладзі ў снежні 1995 года.

Дарэчы, назва ўзнікла тады праз збег абставінаў. Першы фестываль прысвячаўся будучым парламенцкім выбарам у Расіі, і ў дэкарацыі назва “Голосующий” была выпраўлена на “Голосящий”.

Назва прыжылася. Зрэшты, як выявілася, у яе ўсё ж ёсць адзін недахоп: слова “Голосящий” немагчыма адэкватна перакласці на латышскую мову (на беларускую таксама. — *Рэд.*). А ўсе наступныя музычныя фестывалі адбываліся ў Юрмале, у славутай канцэртнай зале “Дзінтары”.

Штогод на гэтым фестывалі досыць яскрава, хаця і без прызоў, выступае наша родная каманда КВЗ. Наша каманда вельмі падабаецца і жыхарам і гасцям Юрмалы. Пра гэта сведчылі натоўпы прыхільніц, якія праследавалі ігракоў каманды БДУ літаральна на кожным кроку: на пляжы, дыскатэцы альбо чарговым канцэрце. Як прызнаўся Кірыл Папакуль, капітан маладой каманды, падарункаў у яго болей, чым сваіх уласных рэчаў. Дзе ж тут не заганарыцца ад свайго таленту?

Ну што ж, будзем чакаць чарговых фестываляў і новых перамог. Галоўнае — не разгубіцца ў патрэбны момант...

*Кацярына САЛАДУХА*

**ПОСТФАКТУМ**

# ЛЕБЯДЗІНАЯ ПЕСНЯ АГАВЫ

Агава амерыканская (па-лацінску “надзвычайная”, “выдатная”) — адзін з 300 відаў агаваў, распаўсюджаных ад поўдня ЗША да тропікаў Паўднёвай Амерыкі. За мінулыя стагоддзі агава здзічэла і шырока распаўсюдзілася ў Паўднёвай Еўропе, Паўночнай Афрыцы і Паўднёва-Усходняй Азіі.

Сама расліна даўно перастала быць дзівам. Любая хоць колькі значная калекцыя раслін уключае агаву. Пры належным доглядзе агава ператвараецца ў магутную расліну, чые моц і памеры так уразілі першапраходцаў Новага Свету, што яна трапіла ў Еўропу яшчэ ў пачатку XVI стагоддзя.

Менавіта такая прыгажуня, разетка шызавата-зялёнага лісця дыяметрам у 3 метры, знаходзіцца ў батанічным садзе факультэта біялогіі Белдзяржуніверсітэта. А ў жніўні агава зацвіла.



Агава — расліна шматгадовая. Сталасць пачынаецца ў 15-гадовым узросце. А напрыканцы трыццацігадовага жыцця расліны настае апошні акт: агава зацвітае, выкідвае стрэлку да 10—12 метраў, на вяршыні якой распускаецца складаная гронка дробных кветак. Іх колькасць даходзіць да 17000. Потым — смерць. Але ў вузлах гронкі нараджаюцца маладыя дробныя агавы.

Агава батанічнага саду зацвіла ў 27 гадоў. Увесну кветкавая пупышка афармілася і пачала расці. За тры месяцы кветканос дасягнуў амаль 5 метраў, і 2 чэрвеня разгарнулася гронка. Але кветкі пачалі раскрывацца толькі ў жніўні. Уся сіла моцнай расліны, галоўная мэта яе існавання, прага жыцця і перамога над смерцю — у пышным і невераголна прыгожым цвіценні.

*Па матэрыялах беларускай прэсы*
*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

**ДЛЯ ЦЯБЕ**

# СТУДЭНЦКАЯ МОДА ВОСЕНІ

Восень прыносіць новыя напрамкі моды, стылі, колеры. Студэнцкая мода вылучаецца экстравагантнасцю, яркасцю, а галоўнае — ад яе павявае маладосцю і навізной.

У новым сезоне формы адзення вельмі свабодныя. Вялікая ўвага надаецца камфорту, і таму тканіны пераважаюць мяккія, пластычныя: бавоўна, трыкатаж, віскоза, тактэль, страда — сінтэтыка новага пакалення. Ва ўсім павінна адчувацца свабода руху. Што да колераў, то вельмі модныя хакі, шэры і чорны, а таксама колеры восені — аранжавы, жоўты, чырвоны. Стыль адзення падобны да вайсковага. Модныя таксама майкі на тонкіх шлейках і брыджы. Для дзяўчат вельмі арыгінальна будуць глядзецца штаны са спадніцай.

Восень — пара дажджоў, таму з нагавіцамі і нават са спадніцай можна апрануць лёгкую куртку з капелюшом. Капялюш і адна вялікая кішэня спераду — новая дэталь сезону.

Галаўныя ўборы, модныя ў гэтым сезоне, — хусткі, у тым ліку завязаныя на цыганскі манер, і маленькія шапачкі, вязаныя аплікам. Галоўнае, што іх можна зрабіць самім, калі ў вас не стае грошай.

Модна таксама насіць невялікія сумкі з грубай тканіны на доўгім пасе і маленькія вязаныя сумачкі.

Абутак мусіць быць утульным — пляскатая падэшва, “платформы” адыходзяць у мінулае.

Дзяўчатам рэкамендуецца выкарыстоўваць касметыку натуральных колераў. На твары мо... на падкрэсліць бляскам вусны і ценямі — вочы.

Аднак стыпендыя студэнтаў не дазваляе ім купляць дарагія рэчы: што купіш на два мільёны рублёў? Не варта губляцца, а трэба памятаць, што адзенне не абавязкова павінна быць дарагім, галоўнае — каб яно выглядала чыста і ахайна. А яшчэ можна перашыць старую вопратку і перагледзець бабулін куфар.

*Ксенія МАСАЛЁВА, студэнтка факультэта журналістыкі БДУ*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Ум. друк. арк. 1
Падпісана да друку ў 12.00

16 верасня
Зак. 648.
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.

Рэдактар Т. М. КАЗАК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка П. Крышаловіча